Установа адукацыі

«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства

| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| --- | --- |
| Загадчык кафедрай | Дэкан факультэта |
| ___________ Д.В. Герасімёнак | ___________ Ю.М. Галкоўская |
| «___» _____________ 2020 г. | «___» _____________ 2020 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**МУЗЕЕФІКАЦЫЯ І АКТУАЛІЗАЦЫЯ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ**

па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Складальнік:
загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства,
кандыдат культуралогіі Д.В. Герасімёнак

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта
17.11.2020 пратакол №2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Электронны вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны рэг. № Е23-2-002/ пр-тып. ад 21.03.2019 г.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Д.В. Герасімёнак**, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**Я.Л. Іванова**, намеснік дырэктара па лічбавым тэхналогіям і сувязях з грамадскасцю дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», кандыдат культуралогіі;

**В.М. Сакалова**, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № __ ад _____.2020 г.);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № __ ад _____.2020 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 7

2.1 План-канспект лекцый 7

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 11

3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 11

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 12

4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў 12

4.2 Пытанні да экзамена 13

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 15

5.1 Тэматычны план 15

5.2 Асноўная літаратура 18

5.3 Дадатковая літаратура 18


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» абумоўлена тым, што аптымальнай формай захавання матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляецца музейная прастора. Музеефікацыя як важны напрамак музейнай дзейнасці заключаецца ў пераўтварэнні ў аб'екты музейнага паказу, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі як нерухомых помнікаў, так і гісторыка-культурнага асяроддзя. У сувязі з гэтым вывучэнне прынцыпаў, метадаў, форм музеефікацыі і актуалізацыі спадчыны з'яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне.

Асноўная *мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны: фарміраванне ў магістрантаў теарэтычных ведаў і практычных навыкаў прымянення тэорыі і практыкі музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны.

*Задачы* вывучэння вучэбнай дысцыпліны: азнаёміць будучых спецыялістаў з сучаснымі дасягненнямі музеефікацыі нерухомых помнікаў гісторыі і культуры; навучыць магістрантаў сучасным формам і метадам захавання і актуалізацыі культурнай спадчыны.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі другой ступені на спецыяльнасці 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны:

Вучэбна-прафесійныя кампетэнцыі:

– ВПК-2. Валодаць уменнем выяўляць, дыягнасціраваць і ранжыраваць актуальныя праблемы ў галіне музейнай справы, распрацоўваць практычныя рэкамендацыі па іх аптымальным вырашэнні.

Спецыяльныя кампетэнцыі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– СК-4. Быць здольным выкарыстоўваць на практыцы метады музеефікацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны, гістарычнай рэканструкцыі, абапіраючыся на вопыт айчынных і замежных музейных устаноў.

У выніку вывучэння дысцыпліны магістрант павінен:

*ведаць:*

– гістарычныя этапы, базавыя характарыстыкі (сутнасць, змест, напрамкі, прынцыпы) аховы і музеефікацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны;
– сучасныя формы і метады захавання, а таксама напрамкі і фактары і актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

*умець*:

– вызначаць сутнасць і інстытуцыйнае вымярэнне паняццяў «музеефікацыя спадчыны», «актуалізацыя спадчыны» і іх нарматыўна-прававое замацаванне ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь аб культуры;
– выяўляць асноўныя заканамернасці фарміравання і развіцця сусветнай практыкі музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны ў залежнасці ад гістарычных і сацыякультурных умоў.

*валодаць*:

– навыкамі прымянення найноўшых навуковых дасягненняў пры вырашэнні актуальных тэарэтычных і практычных праблем музеязнаўства;
– сродкамі эфектыўнага пошуку інфармацыі ў Інтэрнэт, эфектыўнага выкарыстання навуковай літаратуры ў вучэбнай, навуковай і прафесійнай дзейнасці;

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» ўлічваецца яе сувязь з вучэбнымі дысцыплінамі «Актуальныя пытанні музейнай справы», «Гісторыя і метадалогія вывучэнння культурнай спадчыны» і іншымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» прадугледжана 108 гадзін, з якіх 36 – аўдыторныя. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах: лекцыі – 26 гадзін, семінарскія заняткі – 10 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў магістрантаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

*Тэма 1. Уводзіны*

Паняцце і сутнасць музеефікацыі спадчыны. Музеефікацыя як працэс захавання і аптымальнага выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны, выяўлення навуковай і мастацкай каштоўнасці аб’ектаў мінулай эпохі. Актуалізацыя спадчыны.

Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны як вучэбная дысцыпліна. Прадмет і задачы курса. Сувязь музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.

*Тэма 2. Гістарыяграфія музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны*

Узнікненне цікавасці грамадскай супольнасці да аховы помнікаў гісторыі і культуры на навуковай аснове (сярэдзіна XIX – пачатак XX ст.). Гісторыка-археалагічныя і мастацтвазнаўчыя пошукі Ф. Ф. Гарнастаева, І. Я. Забеліна, Г. К. Лукомскага, І. М. Снегірова і інш. Увязденне дэфініцыі «музеефікацыя» ў навуковы зварот (1920-я гг.). Савецкая музеязнаўчая школа. Фарміраванне палажэнняў аб музейным выкарыстанні нерухомых помнікаў. Работы В. В. Аурава, А. С. Давыдавай, А. У. Іконнікава і інш.

Еўрапейскі вопыт асэнсавання паняцця «музеефікацыя» і яго практычнага ўвасаблення. Паняцце і сутнасць тэрміна «камемарацыя» (М. Хальбвакс). Погляды на музеефікацыю як на ідэалізаванаю рэпрэзентацыю каштоўнасцей пэўнай мясцовасці ў якасці патэнцыяльнага музейнага артэфакта.

Сучасны этап вывучэння музеефікацыі культурнай спадчыны. Музеемізацыя. Праблемы ўзаемаадносін музея і грамадства ў працах В. С. Сапанжы, А. А. Сундзіевай, Л. М. Шляхцінай і інш. Музеефікацыя як асноўны напрамак музейнай дзейнасці. Абагульняючыя працы М. Е. Каўлен, Э. А. Шулепавай, Т. Ю. Юрэневай, С. І. Сотнікавай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўка пытанняў музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны беларускімі даследчыкамі (А. І. Смолік, М. А. Бяспалая, І. Г. Лупашка, В. М. Сакалова, Я. А. Кавалёў, Д. В. Герасімёнак і інш.). Замацаванне паняцця «спадчына» у айчынным заканадаўстве, рэнавацыя яе відаў і форм. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры.

*Тэма 3. Тэарэтычныя падыходы і практыка музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны*

Ахова помнікаў гісторыі і культуры як гэта папярэднік і галоўная ўмова музеефікацыі. Эвалюцыя практыкі і асноўныя кірункі музеефікацыі спадчыны. Стварэнне музейнага асяроддзя шляхам калекцыяніравання рухомых прадметаў музейнага значэння, протамузейныя зборы. Спробы музеефікацыі комплексных нерухомых помнікаў на месцы іх бытавання (Геркуланум, Пампеі).

Фарміраванне музеальнасці ў рэзідэнцыях еўрапейскай арыстакратыі. Мемарыяльныя пакоі і кабінеты. Лагойскі музей старажытнасцей К. і Я. Тышкевічаў. Мемарыяльныя музеі ў дамах і сядзібах выдатных дзеячаў гісторыі, мастацтва і культуры.

Сучасны стан аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі. Узаемасувязь адносін да помнікаў гісторыі і культуры ў залежнасці ад сацыяльна-эканамічнай, ідэалагічнай і культурнай эвалюцыі грамадства. Нематэрыяльная культурная спадчына.

Спосабы ўключэння матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў актуальную сацыякультурную прастору. Сучасная практыка стварэння музейнай прасторы на месцы бытавання помніка гісторыі і культуры (кансервацыя, фрагментарная рэстаўрацыя (аналітычны метад), цэласная рэстаўрацыя (сінтэтычны метад).

Формы захавання гісторыка-культурнай спадчыны (фіксацыя, частковая рэканструкцыя, поўная рэканструкцыя «на аптымальную дату», мадэляванне, канструяванне, рэвіталізацыя). Музеефікацыя як завяршальная стадыя, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляе ажыццявіць пераход ад рэвіталізацыі да актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

*Тэма 4. Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны*

Працэс захавання нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны ў рэчышчы прававой палітыкі Расійскай імперыі. Пастановы, указы, цыркуляры міністэрстваў па зборы сведчанняў аб рэштках старажытнасці (1826, 1848, 1866, 1877, 1882, 1903 гг.). Органы дзяржаўнай улады з неабходнымі паўнамоцтвамі па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Фарміраваннне сістэмы навуковых таварыстваў, стварэнне грамадскіх арганізацый.

Заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў перыяд савецкай дзяржаўнасці. Рэгуляванне аховы помнікаў БССР саюзным (1922–1991 гг.) і рэспубліканскім заканадаўствам аб культуры. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.).

Прававое рэгуляванне адносін у сферы аховы і выкарыстання матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі незалежнай Беларусі. Кодэкс Рэспублікі Беларусь «Аб культуры». Юрыдычнае прызнанне спадчыны ў якасці гісторыка-культурнай каштоўнасці. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Міжнародныя дамовы і пагадненні.

*Тэма 5. Музейная прэзентацыя гісторыка-культурнай спадчыны*

Прынцыпы і метады музеефікацыі і прэзентацыі нерухомай культурнай спадчыны беларускімі музеямі. Комплексны характар стварэння музея на месцы бытавання помніка гісторыі і культуры. Праблемы захавання аўтэнтычнасці аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны.

Рэвіталізацыя помнікаў гісторыі і культуры ў залежнасці ад вырашаемых задач. Падрыхтоўчы этап музеефікацыі (збор архіўнага матэрыялу, камплектаванне фондаў і выбар музейных прадметаў і экспазіцыйных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыялаў). Віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях (аднаўленне; дапаўненне; кансервацыя; прыстасаванне; перамяшчэнне; рамонт; раскрыццё; рэгенерацыя; рэканструкцыя; рэстаўрацыя). Праблемы вызначэння сувязі аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны з сацыякультурным развіццём сучаснага грамадства; іх папулярызацыя і інтэрпрэтацыя ў інфармацыйнай прасторы сродкамі музейнай і турысцкай дзейнасці.

*Тэма 6. Перспектывы актуалізацыі і папулярызацыі культурнай спадчыны*

Фактары актуалізацыі культурнай спадчыны на тэрыторыіі Беларусі (спрыяльнае сацыяльна-культурнае асяроддзе, актывізацыя ролі дзяржавы і грамадскіх ініцыятыў, асветніцкай дзейнасці, адраджэнне традыцый, гістарычнай і культурнай памяці, комплекснае выкарыстанне форм і метадаў музеефікацыі матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны). Традыцыйная форма актуалізацыі спадчыны («пад музей» ці «як музей»).

Турысцка-экскурсійная дзейнасць як перспектыўны кірунак актуалізацыі спадчыны. Крытэрыі ацэнкі турыстычнага патэнцыялу аб’екта гісторыка-культурнай спадчыны (навуковая каштоўнасць, аксіялагічная значымасць, ступень захаванасці і прыстасаванасці, магчымасці прэзентацыі і папулярызацыі) Спосабы выкарыстання матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны пад патрэбы турысцка-экскурсійнай дзейнасці.

Сучасныя крыніцы камунікацыі і іх роля ў папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Сацыяльныя сеткі, Інтэрнэт-рэсурсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

**Тэма №1. Музейная прэзентацыя гісторыка-культурнай спадчыны**

1. Прынцыпы і метады музеефікацыі і прэзентацыі нерухомай культурнай спадчыны беларускімі музеямі.

2. Папулярызацыя і інтэрпрэтацыя аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў інфармацыйнай прасторы сродкамі музейнай дзейнасці.

3. Фактары актуалізацыі культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі.

4. Традыцыйныя і інавацыйныя формы актуалізацыі спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў

### Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання магістрантаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў магістрантаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

### Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантаў

Арганізацыя самастойнай работы магістрантаў прадугледжвае падрыхтоўку магістрантамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах курса, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да экзамена і інш.

Самастойная работа магістрантаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамена.

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў**

Арганізацыя вучэбнай работы магістрантаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

- тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ў цэлым;
- пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;
- мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах дысцыпліны;
- выступленні магістрантаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамена.

### 4.2 Пытанні да экзамена

1. Паняцце і сутнасць музеефікацыі і актуалізацыі спадчыны.
2. Гістарыяграфія музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны.
3. Еўрапейскі вопыт асэнсавання паняцця «музеефікацыя» і яго практычнага ўвасаблення.
4. Эвалюцыя практыкі і асноўныя кірункі музеефікацыі спадчыны.
5. Сучасны стан аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны на Беларусі.
6. Спосабы ўключэння матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў актуальную сацыякультурную прастору.
7. Формы захавання гісторыка-культурнай спадчыны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Прававое рэгуляванне адносін у сферы аховы і выкарыстання матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

9. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

10. Віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

11. Праблемы захавання аўтэнтычнасці аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны.

12. Прынцыпы і метады музеефікацыі і прэзентацыі нерухомай культурнай спадчыны беларускімі музеямі.

13. Папулярызацыя і інтэрпрэтацыя аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў інфармацыйнай прасторы сродкамі музейнай дзейнасці.

14. Фактары актуалізацыі культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі.

15. Традыцыйныя і інавацыйныя формы актуалізацыі спадчыны.

16. Спосабы выкарыстання матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны пад патрэбы турысцка-экскурсійнай дзейнасці.

17. Крытэрыі ацэнкі турыстычнага патэнцыялу аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны.

18. Сучасныя крыніцы камунікацыі і іх роля ў папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

### 5.1 Тэматычны план

**Дзённая форма навучання**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| | Уводзіны | 0,5 | | | |
| 1. | Гістарыяграфія музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны | 3,5 | | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 2. | Тэарэтычныя падыходы і практыка музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны | 4 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 3. | Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны | 4 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 4. | Музейная прэзентацыя гісторыка-культурнай спадчыны | 4 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5. | Перспектывы актуалізацыі і папулярызацыі культурнай спадчыны | 4 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| | **Разам:** | **20** | **8** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Завочная форма навучання**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| | Уводзіны | 0,5 | | |
| 1. | Гістарыяграфія музеефікацыі і актуалізацыі культурнай спадчыны | 1,5 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 2. | Тэарэтычныя падыходы і практыка музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны | 2 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія |
| 3. | Музейная прэзентацыя гісторыка-культурнай спадчыны. Перспектывы актуалізацыі і папулярызацыі культурнай спадчыны | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, дыскусія, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| | **Разам:** | **6** | **2** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Асноўная літаратура

1. Герасімёнак, Д. В. Сутнасць музеефікацыі: генезіс і эвалюцыя / Д. В. Герасімёнак // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2016. – № 2 (26). – С. 167-174.

2. Герасімёнак, Д. В. Музеефікацыя сядзібна-паркавых комплексаў Рэспублікі Беларусь як сродак актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.03 / Д. В. Герасімёнак ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2018. – 24 с.

3. Каулен, М. Е. Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен. – М.: Этерна, 2012. – 432 с.

4. Каулен, М. Е. Словарь актуальных музейных терминов / М. Е. Каулен, А. А. Сундиева, И. В. Чувилова [и др.] // Музей. – 2009. – №5. – С. 47-68.

5. Кодекс Рэспублікі Беларусь аб культуры: уступае ў сілу з 3 лютага 2017 г. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 272 с.

6. Мартыненко, И. Э. Понятие и состав историко-культурного наследия Республики Беларусь / И. Э. Мартыненко // Культура: управление, экономика, право. – 2014. – № 3. – С. 20-26.

7. Несцярчук, Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі / Л. М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 283 с.

8. Шулепова, Э. А. Музеефикация памятников / Э. А. Шулепова // Российская музейная энциклопедия: В 2 т. / Рос. ин-т культурологии МК РФ и РАН; редкол.: В. Л. Янин (пред.)[и др.]. – М.: Прогресс: Рипол классик, 2001. – Т. 1.– С. 390-392.

## 5.3 Дадатковая літаратура

1. Ананьев, В. Г. История зарубежной музеологии / В. Г. Ананьев. – СПб. : СПбГУ, 2014. – 136 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Гужалоўскі, А. А. Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с.

3. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 680 с.

4. Культурный ландшафт как объект наследия / под. ред. Ю. А. Веденина, М. Е. Кулешовой. – М.: Институт Наследия; СПб.: Дмитрий Буланин, 2004. – 620 с.

5. Музеі Беларусі = Музеи Беларуси : давед. выданне / рэдкал.: С. Ф. Дубянецкі [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2008. – 559 с.

6. Руководство по выполнению Конвенции об охране всемирного наследия [Электронный ресурс] / ООН по вопросам образования, науки и культуры; Межправительственный комитет по охране всемирного культурного и природного наследия; Центр всемирного наследия. – Режим доступа: http://whc.unesco.org/archive/opguide-rus.pdf.

7. Сапанжа, О. С. Музеология: историография и методология / О. С. Сапанжа ; Рос. гос. пед. ун-т им. А. И. Герцена. – СПб. : Изд-во РГПУ им. А. И. Герцена, 2014. – 111 с.

8. Сапанжа, О. С. Теория музея и музейности: историографический обзор и историческая типология / О. С. Сапанжа. – СПб. : Экспресс, 2011. – 97 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ